# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі. IV клас*

***Ахвотна.***

*1. Злучыце склады так, каб атрымалася слоўнікавае слова.*

хво  тна
а

*Зафарбуйце ў слоўнікавым слове націскны склад.*

*2. Якія літары (або літара) «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

о  во

ах..тна

*Запішыце слоўнікавае слова, падзяляючы яго для пераносу рознымі спосабамі.*

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Як толькі паспеюць арэхі, усё **лясное насельніцтва** ____________ наведвае арэхавыя зараснікі. *(Рыгор Ігнаценка [1, с. 25])*

*4. Прачытайце. Дапоўніце кожны радок слоўнікавым словам.*

☐ Ахвота, ахвотны, ахвотнік, ____________.
☐ З радасцю, з прыемнасцю, ____________.

*Адзначце радок, у якім запісаны аднакаранёвыя словы.*

*5. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Брацік

Я з брацікам гуляю
На вуліцы ____________.
Малюю з ім, чытаю,
Бо ён жа —
Брацік родны. *(Наташа Вярынская [2])*

*Знайдзіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. Абазначце ў гэтых словах канчаткі.*

*6. Разбярыце па саставе слоўнікавае слова **ахвотна**.*

***Паштальён.***

*1. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

о  ч  ш  ё

па..таль..н

*Дапоўніце слоўнікавым словам сказ.*

Паштовы служачы, які разносіць карэспандэнцыю, — гэта ____________.

*2. Прачытайце лічылку. Дапішыце патрэбныя літары ў словы.*

П..штал..ён,
па..тал..ён...
Вось да нас
прыходзіць ён:
— Табе — **ліст**,
табе — п..што..ку.
Калі так —
жмурыся зноўку.
*(Уладзімір Мацвеенка [3, с. 46])*

*Зноўку — зноў.*

*Знайдзіце ў лічылцы аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.*

*Падбярыце сінонім да выдзеленага слова і запішыце: ____________.*

*3. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і ўпішыце ў пустыя клеткі аднакаранёвыя словы да прапанаванага. Зафарбуйце радкі, у якія ўпісаны слоўнікавыя словы.*

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| п | о | ш | т | а | | | | |
| п | | | | | м | т | | |
| п | | | | | | | а | |
| п | | | | | | | | н |

*4. Прачытайце загадку. Дапоўніце яе патрэбным слоўнікавым словам.*

*Злучыце літары, каб атрымалася слова-адгадка.*

Я магу без п____________, ы я
Без ганца, без тэлефона р
З кім захочаце звязаць, ц
Весткі хутка перадаць. а
*(Міхась Пазнякоў [4, с. 95])*

*Ганец — той, каго паслалі з тэрміновым паведамленнем.*

*Знайдзіце і падкрэсліце ў загадцы дзеясловы.*

*5. Дапішыце ў словы прапушчаныя літары.*

П..штовы, п..штальён, п..шта, п..штоўка, п..штамт.

*Сярод слоў знайдзіце і падкрэсліце прыметнік. Дапішыце гэты прыметнік у прапанаваныя спалучэнні слоў.*

____________ скрыня
____________ цягнік
____________ аддзяленне
____________ маркі

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*6. Прачытайце. Дапоўніце тэкст слоўнікавымі словамі.*

Побач з нашай школай знаходзіцца ________. Сёння мы чакаем ______________ з часопісам «Вясёлка». Мы __________ чытаем гэты часопіс. У ім заўсёды можна знайсці цікавыя вершы і апавяданні.

Словы для даведкі: ах..тна, па..тальён, по..та.

*Падкрэсліце ў першым сказе дзейнік і выказнік.*

*Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы, абазначце ў іх корань.*

**Грымець.**

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*

**б = м**



**ець**

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове. Падкрэсліце ў слове літару, якая абазначае няпарны цвёрды зычны гук.*

*2. Прачытайце радкі слоў. Якімі словамі іх можна дапоўніць?*

☐ Гром, пярун, ________.

☐ Моцны, аглушальны, ________________.

☐ Грукатаць, ________.

*Словы для даведкі:* грымотны, грымоты, грымець.

*Дапішыце патрэбныя словы на месцы пропускаў.*

*Адзначце той радок, у якім запісаны дзеясловы.*

*Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

За акном ____________, грукоча гром.

*Падкрэсліце ў сказе галоўныя члены. Назавіце аднародныя члены сказа.*

*3. З дапамогай прыставак* **ад-, за-, пра-** *утварыце новыя словы ад дзеяслова* **грымець**. *Запішыце гэтыя дзеясловы, вызначыце іх час.*

*4. Дапоўніце народную прыкмету слоўнікавым словам.*

Гром ___________іць у кастрычніку — будзе зіма без снегу.

*5. Сярод прапанаваных слоў знайдзіце і закрэсліце лішняе.*

Гром, грымець, грымёрная, грымотны.

*Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.*

*6. Запішыце тэкст пад дыктоўку.*

На небе з'явіліся цёмныя хмары. Загрымелі раскаты грому. Праз некалькі хвілін пайшоў дождж.

*Падкрэсліце галоўныя члены сказа.*

**Ледзьве.**

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 3 | 2 | 1 | 4 | 7 | 6 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| д | е | л | з | е | в | ь |

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Злучыце словы ў левым слупку з яго значэннем у правым слупку.*

| | |
|---|---|
| ледзьве | насілу, з вялікімі цяжкасцямі |
| | больш, чым патрэбна |

*3. Сярод запісаных слоў знайдзіце і падкрэсліце сінонімы.*

Ледзь, многа, ледзьве, ціха.

*Выдзеліце корань у аднакаранёвых словах.*

*4. Прачытайце. Дапішыце ў загадку слоўнікавае слова і адгадайце яе.*

По падлозе мчыць Ягорка —
пачалася сануборка.
___________ ўзяўся працаваць —
стаў паціхеньку спяваць.
А парадак навядзе —
у свой кут ён зноў ідзе.

*(Нічыпар Парукаў* [5, с. 12])



**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Ігнаценка, Р.* Дзе матылькі зімуюць / Рыгор Ігнаценка. — Мінск : Мастацкая літаратура. 1974. — 36 с.
2. Вясёлка — 2002. — № 8. — С. 4.
3. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка: Вершы, загадкі, казкі : для малод. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
4. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні: азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скарагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / Міхась Пазнякоў ; маст. Марыся Лось. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
5. *Парукаў, Н. І.* Зорачкі-пушынкі: Загадкі : для мал. і сярэд. школ. узросту. — Мінск : Нар. асвета, 1980. — 31 с., іл.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://www.raskraska.com/catalog0001/6576.gif; http://printonic.ru/uploads/images/2016/03/01/. tmb/thumb_img_56d57daa553b6_resize_0_215.jpg

***Свірыдзенка В. І.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*